# БЕЛАРУСЬ

## Міжнародная справаздача аб свабодзе веравызнання за 2005 год

Падрыхтаваная Бюро па пытаннях дэмакратыі, правоў чалавека і працы.

Канстытуцыя гарантуе права на свабоду веравызнання, тым не менш урад на справе абмяжоўвае гэтае права.

На працягу справаздачнага перыяду павага да свабоды веравызнання ў цэлым працягвала зніжацца і заставалася нездавальняючай, хоць назіраліся часам некаторыя змены ў лепшы бок. У адпаведнасці з прынятымі ў 2002 годзе Законам аб рэлігіі і ў 2003 годзе пагадненнем з Беларускай праваслаўнай царквой (БПЦ), урад працягваў абмяжоўваць свабоду веравызнання. Нягледзячы на тое, што ў краіне не існуе дзяржаўнай рэлігіі, пагадненне гарантуе БПЦ прывілеяванае становішча. Улады працягвалі праследаванне шэрагу рэлігій і канфесій, у прыватнасці тых, што трактаваліся як праваднікі іншаземнага культурнага ўплыву або як палітычна заангажаваныя. У прыватнасці, пратэстанты заслужылі негатыўнае стаўленне да сябе, дзякуючы сваім відавочным дачыненням са Злучанымі Штатамі. Закон аб рэлігіі 2002 года прадпісаў усім рэлігійным суполкам прайсці перарэгістрацыю. Улады адмовілі ў перарэгістрацыі некаторым рэлігійным меншасцям, у тым ліку шэрагу пратэстанцкіх суполак, праваслаўных аб'яднанняў, што не ўваходзяць у БПЦ, і некаторым усходнім рэлігіям. Многія з гэтых суполак, не атрымаўшы рэгістрацыі, сутыкнуліся з праблемамі з боку ўладаў і з цяжкасцямі ў сваёй дзейнасці.

Тым не менш, за справаздачны перыяд сітуацыя змянілася ў лепшы бок у дачыненні да шэрагу рэлігійных меншасцяў, у тым ліку рымска-каталіцкай царквы і адвентыстаў 7-га дня, і пераважная большасць рэлігійных абшчын паспяхова выканала ўсе патрабаванні да рэгістрацыі, прад'яўленыя Законам аб рэлігіі 2002 года.

Пераважна прыязныя адносіны паміж рэлігіямі і пашыраная ў грамадстве этыка памяркоўнасці спрыялі свабодзе веравызнання, аднак варожае і нецярплівае стаўленне некаторых афіцыйных асобаў і прадстаўнікоў прэсы падтрымлівала негатыўныя адносіны да некаторых рэлігійных меншасцяў і да іудзеяў.

Урад Злучаных Штатаў Амерыкі абмяркоўвае пытанні свабоды рэлігіі з урадам Беларусі ў межах сваёй знешнепалітычнай дзейнасці па абароне правоў чалавека.

### Частка 1. Рэлігійная дэмаграфія

Тэрыторыя краіны складае 80154 квадратныя мілі, а насельніцтва прыкладна 9990000 чалавек.

Гістарычна склалася, што дзяржава была арэнай як суіснавання, так і суперніцтва ды канфліктаў паміж праваслаўем і каталіцызмам. Паводле апытанняў, блізу 50 адсоткаў беларусаў усведамляе сябе вернікамі. Урад падкрэслівае, што сярод усіх людзей, што спавядаюць розныя рэлігіі, прыкладна 80 адсоткаў належаць да БПЦ, 14 адсоткаў вызнаюць каталіцтва, або з'яўляюцца прыхільнікамі рымска-каталіцкай царквы, і 2 адсоткі складаюць пратэстанты. Ад 50 да 70 тысяч усведамляюць сябе іудзеямі. Існуюць таксама прыхаджане грэка-каталіцкай царквы, праваслаўных абшчын, што не ўваходзяць у БПЦ, ды ўсходніх рэлігій. Да

іншых рэлігійных меншасцяў адносяцца крышнаіты, індуісты, бахаісты, адвентысты 7-га дня, стараверы, мусульмане, іегавісты, хрысціяне веры апостальскай, кальвіністы, лютэране і некаторыя іншыя. Паводле даных Камітэта па справах рэлігій і нацыяльнасцяў (КСНР), на травень 2005 года ў Беларусі было 2829 зарэгістраваных рэлігійных арганізацый. Сюды ўваходзяць прэсвітэрыянская царква, якую ўлады ўпершыню зарэгістравалі ў 2004 годзе, а таксама 1290 беларускіх праваслаўных, 450 рымска-каталіцкіх, 70 адвентысцкіх, 25 іудзейскіх, 30 мусульманскіх ды 30 стараверскіх абшчын. Дакладныя лічбы зарэгістраваных евангелісцкіх, баптысцкіх і грэка-каталіцкіх суполак недаступныя.

У 1989 годзе Беларусь была вызначана як экзархат Рускай праваслаўнай царквы, у гэты ж час была ўтворана БПЦ на чале з патрыяршым экзархам мітрапалітам Філарэтам. На канец справаздачнага перыяду колькасць прыходаў па краіне складала блізу 1290. У краіне існуюць таксама іншыя праваслаўныя канфесіі, якія адчуваюць жорсткую дыскрымінацыю. Не маючы магчымасці зарэгістравацца без згоды на тое БПЦ, яны фактычна знаходзяцца пад забаронай. Да такіх суполак адносяцца Беларуская аўтаномная праваслаўная царква (БАПЦ), Катакомбная праваслаўная царква, Ісцінная праваслаўная царква і Руская праваслаўная царква за мяжой.

У краіне налічваецца прыкладна 400 рымска-каталіцкіх прыходаў. Галава рымска-каталіцкай царквы, як правіла, не ўцягвае царкву ў палітычныя справы. Кардынал забараніў у касцёлах дэманстрацыю якіх-небудзь нацыянальных і палітычных сімвалаў. За справаздачны перыяд сітуацыя ў дачыненні да каталіцкай царквы ў Беларусі палепшылася. 8 лютага 2005 прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка і кардынал Свёнтак правялі сустрэчу і дамовіліся паляпшаць адносіны паміж уладамі і рымска-каталіцкай царквой.

Прыкладна 120 тысяч грамадзян, паводле ацэнак, мелі напрыканцы савецкага перыяду нацыянальнасць яўрэй, параўнальна з 50-70 тысячамі на канец перыяду, ахопленаму дадзенай справаздачай. Па меншай меры палова сённяшняга яўрэйскага насельніцтва пражывае ў Мінску або ў яго наваколлі. Большасць прадстаўнікоў яўрэйскага насельніцтва, 98 адсоткаў, не з'яляюцца актыўнымі вернікамі. Сярод тых, хто з'яўляецца такімі, бальшыня належыць да рэфармісцкіх альбо кансерватыўных іудзеяў. Існуе таксама невялікая, але актыўная Любавіцкая суполка і аб'яднанне "Хабад". У 2002 годзе ў Мінску быў адчынены яўрэйскі абшчынны цэнтр пры падтрымцы Амерыканскага яўрэйскага аб'яднанага размеркавальнага камітэта.

Невялікая пакуль яшчэ колькасць прыхільнікаў пратэстанцкай веры працягвае расці. Пачынаючы ад 1990 года, колькасць пратэстанцкіх суполак, зарэгістраваных і незарэгістраваных, павялічылася больш чым удвая. Зарэгістраваныя саюзы пяцідзесятнікаў і баптыстаў уяўляюць сабой дзве найбуйнейшыя пратэстанцкія арганізацыі.

Існуе шэраг прыходаў грэка-каталіцкай царквы, да якой калісьці належала прыкладна тры чвэрці насельніцтва краю, аднак яна сур'ёзна пацярпела ад жорсткіх рэпрэсій у царскія і савецкія часы. Зробленая пасля аднаўлення ў 1991 годзе незалежнасці Беларусі спроба адрадзіць гэтую царкву, што прытрымліваецца ў набажэнстве праваслаўнага абраду, аднак падпарадкоўваецца Ватыкану, мела невялікі поспех, што было абумоўлена рашучым супрацівам з боку БПЦ.

У 2002 годзе, пасля расколу беларускай рэлігійнай асацыяцыі мусульман – асноўнага мусульманскага аб'янання, што налічвае 30 тысяч мусульман, якія пражываюць у краіне, - утварылася Духоўнае ўпраўленне мусульман. Гэтае Духоўнае ўпраўленне на сённяшні дзень заяўляе, што ў ягоны склад уваходзяць 300 членаў. Некаторыя члены этнічнай татарскай супольнасці, якая налічвае 10 тысяч этнічных татараў, вызнаюць суніцкі іслам.

## Частка 2. Становішча са свабодай веравызнання

### Прававая і палітычная база

Свабода веравызнання абвешчана Канстытуцыяй, тым не менш дзяржава на практыцы абмяжоўвае гэтае канстытуцыйнае права. Нягледзячы на тое, што выпраўленая ў 1996 годзе Канстытуцыя яшчэ раз пацвердзіла роўнасць усіх рэлігій і канфесій перад законам, яна ўсё ж дапускае агаворку пра тое, што адносіны паміж дзяржавай і рэлігійнымі арганізацыямі "рэгулююцца з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа". Рэгуляваннем усіх рэлігійных пытанняў у рэспубліцы займаецца КСРМ.

Насуперак пратэстам праваабарончых арганізацый, Еўрасаюза і мясцовых рэлігійных суполак, у 2002 годзе прэзідэнт Лукашэнка сваім подпісам афіцыйна ўвёў у дзеянне новы закон аб рэлігіі. Закон сцвярджае "вызначальную ролю Праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа", а таксама гістарычную значнасць Каталіцкай царквы, іудаізму, ісламу і Евангелічна-лютэранскай царквы – веравызнанняў, што прызнаюцца традыцыйнымі для грамадства. І ўсё ж ключавое значэнне адыграюць у гэтым спісе хутчэй сённяшнія інтарэсы, чым гістарычная рэальнасць. Паняцце "традыцыйныя вераванні" не ўлючае ў сябе рэлігійныя абшчыны з глыбокімі гістарычнымі каранямі ў краіне, такія як грэка-каталіцкая царква, заснаваная ў 1546 годзе, кальвінісцкія цэрквы, што дзейнічалі ў краіне з сярэдзіны 17 стагоддзя, альбо стараверскія абшчыны, што з'явіліся на тэрыторыі Беларусі ў канцы 17 стагоддзя.

Нягледзячы на тое, што закон дэкларуе намер гарантаваць свабоду веравызнання, ён утрымлівае цэлы шэраг надзвычай абмежавальных момантаў, што павышаюць узровень кантролю ўрада за дзейнасцю рэлігійных аб'яднанняў. Закон 2002 года патрабуе, каб усе рэлігійныя суполкі папярэдне атрымлівалі дазвол урада на ўвоз і распаўсюджанне рэлігійнай літаратуры, забараняе замежнікам узначальваць рэлігійныя арганізацыі і пазбаўляе суполкі права ствараць духоўныя навучальныя ўстановы для падрыхтоўкі ўласных святароў. У дадатак, закон абмяжоўвае дзейнасць рэлігійных суполак тымі раёнамі, дзе яны зарэгістраваныя. Больш за тое, закон уводзіць складаныя рэгістрацыйныя патрабаванні, якія вельмі цяжка выконваць для многіх як традыцыйных, так і нетрадыцыйных рэлігійных арганізацый. Закон 2002 года запатрабаваў таксама, каб усе зарэгістраваныя раней рэлігійныя групы прайшлі да 17 лістапада 2004 года перарэгістрацыю, і адразу пасля свайго ўступлення ў сілу забараніў любую рэлігійную дзейнасць незарэгістраваных рэлігійных груп.

Мясцовыя рэлігійныя арганізацыі працягвалі заклікаць да адмены па меншай меры часткі прынятага ў 2002 годзе закона. У верасні 2004 года пратэстанцкія суполкі

накіравалі петыцыі прэзідэнту Лукашэнку, у Нацыянальны Сход, Савет міністраў і Канстытуцыйны суд, заклікаючы да перагляду найбольш абмежавальных артыкулаў Закона аб рэлігіі. Яны заявілі, што гэты закон несумяшчальны з Канстытуцыяй і міжнароднымі стандартамі. Яны асабліва адзначылі часткі, што абмяжоўваюць дзейнасць рэлігійнай групы раёнам, у якім яна зарэгістравана, складанасць у атрыманні дазволу на набажэнства ў грамадскіх месцах і вызначэнне ў прэамбуле закона БПЦ як царквы, што адыгрывае галоўную ролю і мае найбольшы ўплыў у краіне. У канцы перыяду, які ахоплівае дадзеная справаздача, прэзідэнт так і не даў адказ на гэтыя і іншыя заклікі рэлігійных арганізацый да перагляду закона. Аднак адзін парламенцкі чыноўнік напісаў адказ, дзе апраўдваецца сённяшняя сітуацыя і захаванне закону ў ягоным цяперашнім выглядзе.

Закон 2002 года вызначае трохузроўневую структуру рэлігійных арганізацый: рэлігійныя суполкі, рэлігійныя аб'яднанні і рэспубліканскія рэлігійныя аб'яднанні. Рэлігійныя суполкі, ці мясцовыя пярвічныя рэлігійныя арганізацыі, павінны налічваць не менш за 20 членаў ва ўзросце не маладзей за 18 гадоў, якія павінны пражываць у дадзенай мясцовасці. Рэлігійныя аб'яднанні складаюцца з 10 суполак, прычым адна з іх павінна дзейнічаць у краіне па меншай меры 20 гадоў, і могуць быць заснаваныя толькі рэспубліканскімі рэлігійнымі аб'яднаннямі (на агульнанацыянальным узроўні). Рэспубліканскія рэлігійныя аб'яднанні ствараюцца толькі ў тым выпадку, калі дзейсныя рэлігійныя суполкі маюцца ў большасці з 6 абласцей краіны. Усе заявы на заснаванне аб'яднанняў і рэспубліканскіх аб'яднанняў падаюцца ў КСРН.

Раней зарэгістраваныя рэлігійныя суполкі маглі перарэгістравацца, калі ў сваім складзе мелі сама меней 10 членаў, у той час як для рэгістрацыі новай суполкі неабходна было 20 членаў. Для рэгістрацыі суполка мусіць прадставіць спіс заснавальнікаў з указаннем іх поўнага імя, месца жыхарства, грамадзянства і асабістымі подпісамі, экземпляры статута, пратакола ўстаноўчага з'езда ўдзельнікаў, а таксама пасведчанне, што пацвярджае права суполкі на валоданне любой маёмасцю, названай у яе ўстаноўчых дакументах. Для тых суполак, якія вызнаюць рэлігіі, раней невядомыя ўраду, павінна быць парадзена інфармацыя пра гэтыя рэлігіі. Заявы на рэгістрацыю разглядаюцца абласнымі выканаўчымі камітэтамі (аблвыканкамамі) і Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам (Мінгарвыканкамам).

Хоць закон і адмаўляе суполкам у праве ствараць навучальныя ўстановы для вернікаў, ён дазваляе ім адчыняць нядзельныя школы. Больш за тое, звычайна ўлады забяспечваюць патрэбы прадстаўнікоў розных рэлігій у дачыненні да розных рэлігійных святаў.

У дадатак да перарэгістрацыі рэлігійных аб'яднанняў, якія існуюць больш за 20 гадоў, КСРН таксама дазваляе перарэгістрацыю шэрагу рэлігійных аб'яднанняў, што былі створаныя да прыняцця закона ў 2002 годзе, аднак яшчэ не перасягнулі дваццацігадовы рубеж. Для атрымання рэгістрацыі аб'яднанні павінны падаць спіс членаў свайго кіруючага органа з біяграфічнымі звесткамі, дакумент, што пацвярджае права размяшчэння ў пэўным раёне і пратаколы ўстаноўчага сходу аб'яднання. Згодна з законам, аб'яднанні валодаюць выключным правам на стварэнне духоўных навучальных устаноў, правам запрашаць замежных грамадзян для работы з адпаведнымі рэлігійнымі групамі і ствараць манастыры і манаскія аб'яднанні.

Паводле справаздачы КСРН за снежань 2004 года, з 2780 рэлігійных суполак, што падалі дакументы на перарэгістрацыю, паспяхова перарэгістраваліся 2676. Сярод 140 рэлігійных аб’яднанняў і рэспубліканскіх рэлігійных аб’яднанняў, якія мусілі перарэгістравацца, 128 прайшлі працэдуру. КСРН засведчыў, што тыя 12 неперарэгістраваных рэлігійных аб’яднанняў самаліквідаваліся па прычыне недахопу членаў і нізкай актыўнасці. Сярод 104 рэлігійных суполак, што не прайшлі перарэгістрацыю, 84 самаліквідаваліся. Прадстаўнікі шэрагу рэлігійных груп адзначылі, што КСРН аказваў істотную дапамогу на працягу ўсяго працэсу. Паводле КСРН, астатнія 20 “не змаглі прайсці перарэгістрацыю па прычыне надзвычай сур’ёзных парушэнняў”. Усе 20 суполак, якім было адмоўлена ў перарэгістрацыі, прадстаўляюць рэлігіі, якія ўрад разглядае як нетрадыцыйныя. Для прыкладу, у перарэгістрацыі было адмоўлена шэрагу цэркваў хрысціян поўнага Евангелля і крышнаітаў.

Пагадненне, заключанае ў 2003 годзе паміж БПЦ і ўрадам, гарантуе БПЦ самастойнасць у яе ўнутраных справах і магчымасць карыстацца ўсімі сваімі рэлігійнымі правамі, таксама як і правам лічыць сябе ў асаблівых адносінах з дзяржавай. Пагадненне прызнае за БПЦ “уплыў на фарміраванне духоўных, культурных і нацыянальных традыцый беларускага народа”. Пагадненне заклікае ўрад і БПЦ да супрацоўніцтва пры правядзенні сваёй палітыкі ў розных сферах, уключаючы адукацыю і ахову культурнай спадчыны, а таксама бяспеку. Хоць у дакуменце і сцвярджаецца, што пагадненне не замахваецца на рэлігійную свабоду іншых канфесій, яно ў той самы час заклікае ўрад і БПЦ аб’явіць вайну неназваным “псеўдарэлігійным структурам, якія ўяўляюць небяспеку для асобы і грамадства”. Нягледзячы на шэраг падпісаных за апошнія некалькі гадоў пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж БПЦ і разнастайнымі ўрадавымі ўстановамі, роля БПЦ у дзейнасці дзяржаўных арганізацый, паводле наяўных звестак, застаецца досыць малой.

Тым не менш, у кастрычніку 2004 года прэзідэнт Лукашэнка падкрэсліў нязменную важнасць БПЦ: “Я вельмі хачу, каб праваслаўная царква заставалася ў рамках нашай дзяржавы. Я хачу, каб праваслаўная царква была інстытутам нашай дзяржавы і адным з яе галоўных апірышчаў.” Затым Лукашэнка выказаўся ў падтрымку цяперашняй сітуацыі і супраць “замежных” рэлігій, гаворачы, што некаторыя члены апазіцыі, падбухтораныя замежнымі фаварытамі, робяць правакацыйныя прапановы звузіць сферу дзейнасці традыцыйных рэлігій, у першую чаргу, праваслаўнай царквы, на карысць разнастайных сектаў і рэлігій, нетрадыцыйных для нашай краіны.

У сакавіку 2004 года Нацыянальны камітэт па пытаннях інтэлектуальнай_уласнасці прадставіў БПЦ выключнае права на выкарыстанне ў яе назве слова “праваслаўны” і на выкарыстанне ў якасці сімвала выявы крыжа Ефрасінні Полацкай, святой заступніцы Беларусі. Гэтыя захады можна лічыць дадатковым сродкам умацавання становішча БПЦ як адзіна дазволенай праваслаўнай веры ў краіне.

Улады лічаць усе групы, што, па іх меркаваннях, не адносяцца да традыцыйных рэлігій, “нетрадыцыйнымі”, прычым службовыя асобы і дзяржаўныя СМІ ў дачыненні да апошніх шырока выкарыстоўваюць тэрмін “секта”, хоць ён і не з’яўляецца афіцыйным абазначэннем.

Паводле прынятай у 2001 годзе пастановы, урад патрабуе, каб арганізацыя падавала пісьмовую заяўку на запрашэнне ў краіну замежнага святара з указаннем часу знаходжання і мэты візіту. Нават калі візіт мае нерэлігійны характар і звязаны, напрыклад, з дабрачыннай дзейнасцю, прадстаўнік павінен атрымаць візу і дазвол ад КСРН. Камітэт мае 20 дзён для адказу, прычым абскарджанне яго рашэння не прадугледжваецца. Заканадаўства забараняе ў краіне "падрыўную дзейнасць" замежных арганізацый і накладае забарону на стварэнне аддзелаў замежных арганізацый, дзейнасць якіх узбуджае "нацыянальную, рэлігійную і расавую варожасць" або можа "аказаць негатыўны ўплыў на фізічнае і духоўнае здароўе народа".

Некаторыя абмежаванні свабоды веравызнання ўзнікаюць пад уплывам іншых беларускіх законаў, што абмяжоўваюць асноўныя свабоды чалавека. Як заяўляе КСРП у сваім адказе на "Міжнародную справаздачу аб свабодзе веравызнання за 2004 год", падрыхтаваную Дзяржддэпартаментам ЗША, "санкцыі супраць прадстаўнікоў рэлігійных аб'яднанняў прымяняюцца ў выпадку парушэння закона і не накіраваныя на абмежаванне свабоды веравызнання". Звычайна лідэры абвінавачваюцца ў арганізацыі сходаў або прадстаўленні памяшканняў для недазволеных сустрэч. Гэта абвінавачанне вынікае з закона, што абмяжоўвае свабоду сходаў, а не з якога-кольвечы закона аб рэлігіі.

Урад заяўляе, што закон дазваляе выкарыстоўваць жылую маёмасць для рэлігійных службаў толькі пасля яе вывядзення з жылога фонду. Жыллёвы кодэкс дазваляе выкарыстанне такой маёмасці ў іншых мэтах пры дазволе мясцовых выканаўчых і адміністрацыйных арганаў.

Ад дзяржаўных служачых не патрабуецца даваць нейкіх рэлігійных клятваў ці вызнаваць канкрэтную рэлігію.

### Абмежаванні свабоды веравызнання

Урадам як актыўным, так і пасіўным чынам абмяжоўваецца свабода веравызнання. Урад актыўна прымае законы, што абмяжоўваюць свабоду набажэнстваў, свабоду слова, свабоду сходаў. Урад у недастатковай ступені асуджае акты рэлігійнай абыякавасці і нецярпімасці. Некаторыя з 2829 зарэгістраваных рэлігійных суполак прайшлі рэгістрацыю толькі на мясцовым узроўні, што прывяло да абмежавання іх правоў. Некаторыя канфесіі, зарэгістраваныя і не, сутыкнуліся са складанасцямі з арэндай або набыццём нерухомай маёмасці для абсталявання памяшканняў для набажэнстваў, пабудовы цэркваў ( напрыклад, грэка-каталіцкія і пратэстанцкія суполкі) або адкрыцця духоўнай школы.
Насуперак чаканням шматлікіх назіральнікаў, КСРН паведаміў, што аблвыканкамы і Мінгарвыканкам перарэгістравалі 99,3 адсоткі тых рэлігійных суполак, якія не самаліквідаваліся. Такім чынам, чаканні таго, што ўрад выкарыстае перарэгістрацыю з мэтай масавых рэлігійных рэпрэсій, не спраўдзіліся. Але нават у гэтым выпадку перарэгістрацыя сама па сабе не гарантавала свабоды веравызнання, і КСРН працягваў адмаўляць у перарэгістрацыі некаторым групам. Прычыны адмовы пры гэтым абумоўліваліся палажэннямі закона, аднак відавочна адвольнае прымяненне закона прывяло да абмежавання свабоды веравызнання.

18 жніўня 2004 года Аб'яднанне камітэтаў у абарону яўрэяў краін былога СССР (UCSJ) было адмоўлена ў рэгістрацыі ў сувязі з тым, што некаторыя дакументы былі прадстаўлены са спазненнем. UCSJ – адна з першых яўрэйскіх

праваабарончых арганізацый у краіне. Да таго яна была зарэгістраваная Міністэрствам замежных спраў як адно з адгалінаванняў замежнай арганізацыі. UCSJ абскардзіў адмову ў Вярхоўным судзе, але па тэхнічных прычынах суд адхіліў разгляд справы. Гэта не пакінула іншага выйсця, як закрыцца. Аднак дзеянні ўрада не далі магчымасці UCSJ афіцыйна спыніць сваю дзейнасць. Следам за адмовай у перарэгістрацыі ўлады замарозілі банкаўскія рахункі арганізацыі, пазбавіўшы яе магчымасці заплаціць за арэнду памяшканняў, падаткі і выдаць выхадную дапамогу сваім супрацоўнікам. У сярэдзіне чэрвеня 2005 года UCSJ урэшце атрымаў магчымасць доступу да сваіх банкаўскіх рахункаў і змог заплаціць за арэнду і выдаць заробкі супрацоўнікам. Тым не менш, арганізацыя заставалася незарэгістраванай да канца перыяду, ахопленага дадзенай справаздачай.

Згодна са службай навін "Форуму – 18", у 2003 годзе Уладзімір Ламека, намеснік старшыні КСРН, загадаў мясцовым уладам узмацніць кантроль за дзейнасцю рэлігійных арганізацый, рэгулярна неведваць набажэнствы і сустракацца з рэлігійнымі лідэрамі, а таксама пастаянна кантраляваць і спыняць дзейнасць незарэгістраваных рэлігійных груп. Сп. Ламека спаслаўся на "грубыя парушэнні" закона ў Нясвіжы "пераважна пратэстанцкімі суполкамі" і заклікаў мясцовых службовых асобаў актывізаваць намаганні па "ўрэгуляванні этна-канфесійнай сітуацыі". Акрамя таго, сп.Ламека даў указанне мясцовым чыноўнікам не дазваляць асноўнай арганізацыі польскай меншасці ў краіне карыстацца маёмасцю рымска-каталіцкай царквы і праводзіць "сістэматычную працу" з мясцовымі каталіцкімі лідэрамі, каб забяспечыць прапаведаванне замежнымі каталіцкімі рэлігійнымі дзеячамі на беларускай або рускай мове. Пасля такога загаду сп.Ламекі прадстаўнікі суполак Саюза евангельскіх хрысціян і баптыстаў скардзіліся, што школьныя настаўнікі пачалі апытваць дзяцей на прадмет прыналежнасці да гэтых цэркваў, пра іх удзел у рэлігійных абрадах з мэтай выяўлення тых школьнікаў, што маюць дачыненне да пратэстанцкай рэлігійнай дзейнасці. На працягу справаздачнага перыяду такія апытанні, па звестках, працягваліся, хоць і ў меншай ступені.

У адпаведнасці з палажэннямі Закона аб рэлігіі 2002 года, групы, не кваліфікаваныя як рэспубліканскія аб'яднанні, як напрыклад, грэка-каталіцкая царква, не маюць права публікавацца ў прэсе, будаваць манастыры або запрашаць ў краіну замежных грамадзян з мэтай прыцягнення іх да рэлігійнай дзейнасці.

Тэарэтычна грамадзянам не забараняецца схіляць іншых асоб у сваю веру, і яны могуць адкрыта выказваць свае рэлігійныя погляды, аднак улады часта намагаюцца што-небудзь забараніць, умяшацца або пакараць пэўных асоб, што агітуюць ад імя сваёй зарэгістраванай ці незарэгістраванай царквы. Улады рэгулююць кожны аспект схілення ў сваю веру і распаўсюджання літаратуры: хто можа ўдзельнічаць, што можна рабіць, дзе і калі могуць дзейнічаць групы. Урад працягваў ажыццяўляць пастанову Савета міністраў ад 1995 года, якая рэгулюе дзейнасць рэлігійных работнікаў, а таксама пастанову Савета міністраў ад 1997 года, што дазваляе зарэгістраваным рэлігійным групам выкладаць рэлігію ў моладзевых лагерах.

Улады працягвалі праследаваць, спаганяць штрафы і затрымліваць прадстаўнікоў Харэ Крышна за незаконнае распаўсюджанне рэлігійнай літаратуры. У справаздачны перыяд мінскія ўлады ў чарговы раз адхілілі запыт Харэ Крышна на

атрыманне дазволу распаўсюджваць у горадзе рэлігійныя матэрыялы, робячы, такім чынам, любое размеркаванне крышнаіцкай літаратуры незаконным.

Замежным місіянерам не дазваляецца займацца рэлігійнай дзейнасцю па-за сценамі ўстаноў, якія іх запрасілі. Закон патрабуе, каб такія дзеячы мелі на руках гадавыя візы на шматразовы ўезд з дазволам займацца "духоўнай дзейнасцю". Рэлігійныя групы, нават тыя, што даўно існуюць у краіне, а таксама асобныя прадстаўнікі па-ранейшаму маюць цяжкасці пры атрыманні візаў. Нават місіянеры, якія дзейнічаюць законна і адкрыта, маючы місіянерскую візу, часта церпяць нападкі з боку ўладаў, асабліва ў тым выпадку, калі яны прыбываюць з Захаду.

Тым не менш, не існуе інфармацыі пра адмову ў візе або ануляванне візы для заходніх місіянераў; улады, паводле наяўных звестак, прымушаюць чакаць да апошняй хвіліны працягнення візы або вымушаюць іх несці дадатковыя выдаткі на паездку ў Літву для атрымання кароткатэрміновых візаў, каб не губляць час у чаканні выдачы місіянерскай візы. Па меншай меры адзін пратэстанцкі місіянер і яго мясцовыя калегі былі паўторна выкліканы і распытаны наконт крыніцаў фінансавання і атрымання грошай, не зважаючы на той факт, што прапаведнік знаходзіўся ў краіне больш за пяць гадоў і не меў ніякіх праблем з візай і законам.

Ад часу свайго адраджэння ў 1991 годзе рымска-каталіцкая царква адчувае недахоп у кваліфікаваных мясцовых святарах. Час ад часу царква сутыкаецца са складанасцямі пры атрыманні дазволу ад уладаў, пераважна ў Гродне, на запрашэнне дастатковай колькасці замежных рэлігійных работнікаў, у першую чаргу з Польшчы, для ліквідацыі гэтага недахопу.

Наяўнасць арэнднага пагаднення з'яўляецца абавязковай умовай атрымання юрыдычнага адрасу і дае магчымасць у далейшым падаваць на рэгістрацыю ў якасці рэлігійнай групы або царквы.

Атрыманне візаў замежнымі прапаведнікамі або рэлігійнымі работнікамі часта ператвараецца ў доўгую бюракратычную працэдуру. Органы ўнутраных спраў могуць выдварыць замежных святароў з краіны, адмовіўшы ім у працягненні рэгістрацыі або не выдаўшы дазвол на часовае знаходжанне. Гэтыя органы могуць прымаць рашэнне аб высылцы самастойна або на падставе рэкамендацый Саветаў па справах рэлігій пры аблвыканкамах ці Упраўлення па справах рэлігій Мінгарвыканкама.

Згодна з палажэннямі, што рэгулююць выкарыстанне жылой маёмасці для правядзення рэлігійных службаў, шэраг пратэстанцкіх суполак і іншыя нетрадыцыйныя канфесіі апынуліся фактычна ў замкнёным коле. Ім не даюць дазвол на выключэнне сваёй уласнасці з жылога фонду для выкарыстання яе ў рэлігійных мэтах, таму што яны не з'яўляюцца зарэгістраванымі рэлігійнымі групамі, але без адрасу яны не могуць быць зарэгістраваныя. Рэлігійныя групы, што не могуць зарэгістравацца, часта вымушаны сустракацца нелегальна або дома ў сваіх членаў.

Па інфармацыі "Форума- 18", у чэрвені 2005 года ўлады папярэдзілі святара Рускай праваслаўнай царквы за мяжой айца Леаніда Пляца, што ён можа апынуцца ў зняволенні ці атрымаць вялізны штраф у выпадку, калі будзе працягваць "незаконную рэлігійную дзейнасць". Паколькі Руская праваслаўная

царква за мяжой не  зарэгістравана, любая яе дзейнасць, акрамя невялікіх сходаў дома, можа трактавацца як “незаконная рэлігійная дзейнасць”.

У той час як пратэстанты і грэка-каталікі сведчаць, што ім стала нашмат прасцей, чым у папярэднія гады, арэндаваць памяшканні для рэлігійнай службы ў Дамах і Палацах культуры, нетрадыцыйныя рэлігійныя групы, як і раней, атрымліваюць адмовы ў прадастаўленні памяшканняў для рэлігійных мэтаў. У адказ на запыты наконт дазволу арэндаваць маёмасць, КСРН патлумачыў, што толькі мясцовыя ўлады маюць права вырашаць, даваць такі  дазвол ці не.

За справаздачны перыд многія традыцыйныя і нетрадыцыйныя рэлігійныя групы па-ранейшаму мелі праблемы пры набыцці маёмасці ва ўласнасць або пры рэгістрацыі маёмасці, якой яны ўжо валодалі да таго, у сувязі са спробамі ўладаў перашкодзіць гэтым групам у стварэнні іх культавых месцаў. У 2003 годзе гарадскія ўлады Слоніма аказалі ўціск на дырэктара мясцовага Палаца культуры дзеля таго, каб ён скасаваў арэндную дамову, заключаную ім з Царквой поўнага евангелля новага пакалення. На канец справаздачнага перыяду царква так і не здолела знайсці памяшканне для легальных сустрэч.

У 2003 годзе мясцовыя ўлады анулявалі раней прынятае рашэнне пра выдзяленне ўласнасці суполцы пяцідзесятнікаў у пасёлку Дружны, заявіўшы, што суполка павінна спачатку высветліць грамадскую думку жыхароў населенага пункта. Абласныя ўлады адмянілі гэтую ўмову, і тады мясцовыя ўлады прапанавалі суполцы тры зямельныя надзелы на выбар.

У чэрвені 2005 года КСРН нарэшце падтрымаў просьбу зарэгістраванай суполкі хрысціян поўнага Евангелля аднавіць дом у Бараўлянах, каб скарыстоўваць яго ў якасці царквы. У 2002 годзе мясцовыя ўлады ў Бараўлянах адмовілі ў дазволе зарэгістраванай суполцы хрысціян поўнага Евангелля пераабсталяваць прыватны дом пад царкву. Нягледзячы на тое, што суполка атрымала ўсе належныя дазволы ад мясцовых уладаў, орган па справах рэлігій адмовіў ёй у дазволе. Чыноўнікі КСРН пры гэтым спасылаліся на напісаны групай праваслаўных жыхароў пасёлка ліст са скаргамі на тое, што члены суполкі хрысціян поўнага Евангелля незаконна пранікаюць у хаты з мэтай схіліць грамадзян у сваю веру, выкрадаюць праваслаўныя крыжыкі ў тых, хто іх носіць, і яны быццам належаць да незарэгістраванай “секты”.

Царква новага жыцця ў Мінску, член Саюза цэркваў поўнага Евангелля, можа вымушана спыніць сваю дзейнасць, таму што ўлады адмовіліся рэгістраваць прыход ў кароўніку, які знаходзіцца ва ўласнасці царквы і які яна хоча выкарыстоўваць як памяшканне для набажэнстваў. Царква новага жыцця, вядомая як “Царква ў кароўніку”, набыла хлеў і навакольную маёмасць  тры гады таму. Паства пачала збірацца там пасля таго, як атрымала адмову на арэнду якога-кольвечы іншага памяшкання. Аднак мясцовыя ўлады не далі Царкве новага жыцця дазволу на пераабсталяванне кароўніка такім чынам, каб будынак мог быць зарэгістраваны, і не дазволілі прыхаджанам сустракацца ў будынку, якім ён ёсць цяпер. Таму Царква новага жыцця не мае месца для набажэнства і не мае месца, якое можна зарэгістраваць, што робіць любую яе дзейнасць нелегальнай. Пастар і іншыя лідэры Царквы новага жыцця атрымліваюць вялікія штрафы за адпраўленне нелегальных набажэнстваў, бо тэхнічна парушаюць Закон аб сходах. У той самы час улады далі дазвол суполкам БПЦ бесперашкодна сустракацца ў пераабсталяваным вагоне цягніка на адлегласці менш за мілю ад іх.

Мінская суполка Свядомасці Крышны (Харэ Крышна), якая налічвае тысячу членаў, таксама сутыкаецца з забаронай сходаў і робіць спробы зарэгістраваць маёмасць, якой ужо валодала да таго. Мясцовыя ўлады адмаўляюцца рэгістраваць крышнаіцкую суполку ў будынку, які быў набыты ёю ў 1990 годзе і з таго часу выкарыстоўваўся як месца адпраўлення культу, патлумачыўшы гэта тым, што будынак прыстасаваны толькі для выкарыстаня ў якасці жылога памяшкання, а не для рэлігійных патрэбаў. Мінгарвыканкам накіраваў суполцы два папярэджанні, першае ў кастрычніку 2004 года, а затым у лютым 2005 года, інфармуючы, што будынак не рэгістраваўся як месца для сходаў. У час, ахоплены дадзенай справаздачай, мінская суполка Свядомасці Крышны падала апеляцыю ў Камісію па правах чалавека пры ААН, перашкодзіўшы такім чынам ураду закрыць гэтую суполку, паколькі апеляцыйны працэс быў распачаты.

За разгледжаны справаздачай перыяд не мелася паведамленняў з боку рэлігійных груп пра выпадкі высялення з памяшканняў, аднак улады , як і раней, спынялі несанкцыянаваныя рэлігійныя сходы на кватэрах.

Пастанова ўрада прадугледжвае канкрэтныя меры па забеспячэнні грамадскага парадку і бяспекі пры правядзенні масавых грамадскіх мерапрыемстваў. Адміністрацыі некаторых грамадскіх аб’ектаў, спасылаючыся на гэтую пастанову, скасавалі рэлігійным групам арэндныя дамовы на выкарыстанне сваіх аб’ектаў або адмовілі ў іх падаўжэнні. За справаздачны перыяд было практычна немагчыма для рэлігійных груп арэндаваць памяшканне на грамадскіх аб’ектах для правядзення сходаў.

Згодна інфармацыі службы навін “Форума-18”, у сакавіку 2004 года мінскія гарадскія ўлады адхілілі заяўку кальвінісцкай рэфармісцкай царквы на правядзенне міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай 450-ай гадавіне заснавання царквы ў краіне. Паводле наяўных звестак, мінскія гарадскія ўлады паведамілі царкве пра тое, што яна не мае права праводзіць міжнародную канферэнцыю, паколькі не зарэгістраваная як рэспубліканскае рэлігійнае аб’яднанне, нават не зважаючы на тое, што Закон аб рэлігіі дазваляе рэлігійным арганізацыям запрашаць іншаземцаў для ўдзелу ў сходах, паломніцтвах і іншых мерапрыемствах.

Нягледзячы на свой беспадатковы статус, некаторыя пратэстанцкія суполкі паведамлялі, што падатковыя органы паўторна аштрафавалі іх за ўхіленне ад уплаты падаткаў з дапамогі, што ішла абяздоленым сем’ям і асобным людзям.

Хоць паведамленняў пра антыпратэстанцкія публікацыі ў дзяржаўных СМІ не мелася, дзяржаўныя выданні працягваюць свае нападкі на іншыя нетрадыцыйныя канфесіі. У выпуску газеты “Знамя юности” за красавік 2004 года апублікаваны артыкул, які называе Царкву Уніфікацыі, Царкву Хрыста і Саенталагічную царкву аднымі з самых небяспечных “сектаў” у краіне.

Артыкул у газеце “Минский курьер” за сакавік 2004 года ўтрымліваў крытыку прыхільнікаў Царквы Уніфікацыі і Харэ Крышна. У артыкуле сцвярджалася, што яшчэ ў 1997 годзе Харэ Крышна была вызначана як “дэструктыўная таталітарная секта”. Як паведамляюць прадстаўнікі гэтай суполкі, улады ніколі не давалі такога вызначэння. Пад час сустрэчы з крышнаітамі аўтар-журналіст прызнаўся, што

такія лжывыя звесткі былі прадстаўлены Камітэтам дзяржаўнай бяспекі (КДБ), што пазней пацвердзіў і сам беларускі КДБ.

Міністэрства адукацыі працягвае рэкамендаваць для выкарыстання ў школах падручнік “Чалавек, грамадства, дзяржава”, у якім суполкі пратэстантаў і Харэ Крышна называюць “сектамі”, нават не зважаючы на пратэсты рэлігійных груп. Правёўшы аналіз кнігі, КСРН і Міністэрсва адукацыі прыйшлі да высновы, што слова “секта” з’яўляецца “навуковым тэрмінам” і не навешвае на Харэ Крышна і пратэстантаў ярлык антысацыяльных арганізацый. Міністэрства адукацыі паабяцала перагледзець параграфы, якія выкарыстоўваюць такую лексіку, пры наступных перавыданнях падручніка.

Лідэры пратэстанцкіх суполак таксама пратэставалі супраць мовы падручніка “Асновы бяспекі жыццядзейнасці” як наўмысна прадузятай ў адносінах да пратэстантаў, асабліва ў раздзеле пад назвай “Беражыцеся сектаў”. Раздзел уключае параграф, які расказвае вучням пра такія “секты” як адвентысты 7-га дня, Царква Марыі, Белае брацтва і Сведкі Іеговы. У студзені 2005 года пратэстанцкія лідэры накіравалі ліст пратэсту прэзідэнту, лідэрам Нацыянальнага Сходу, у КСРН і Міністэрства адукацыі. Міністэрства адукацыі паабяцала разгледзець справу. КСРН ужо азнаёміўся з заявай і паведаміў, што ў кнізе не мелася парушэння правоў пратэстантаў.

Калі за справаздачны перыяд, паводле наяўных звесткак, не было публікацый антыпратэстанцкай літаратуры або артыкулаў у дзяржаўных СМІ, дык продаж і распаўсюджанне антысеміцкай літаратуры як праз сетку Саюздруку ды дзяржаўныя ўстановы, так і праз кнігарні, што супрацоўнічаюць з БПЦ, працягваліся. Як і ў мінулыя гады, антысеміцкую літаратуру працягвалі прадаваць у фае Нацыянальнай акадэіі навук.

У апошнія гады антысеміцкую літаратуру адкрыта прапаноўвалі падчас правядзення ў Мінску розных праваслаўных кніжных кірмашоў, а таксама ў доме-прытулку і ў мінскім хоспісе, заснаваным па ініцыятыве БПЦ. А прадстаўнікі рымска-каталіцкай царквы паведамлялі, што ў месцах, звязаных з БПЦ, таксама прадаецца і антыкаталіцкая літаратура. Антысеміцкія і рускія ультранацыяналістычныя газеты і літаратуру працягвалі распаўсюджваць праз кнігарню “Праваслаўная кніга”, прызначаную для продажу праваслаўнай літаратуры і рэлігійнай атрыбутыкі. “Праваслаўная кніга” з’яўляецца часткай кампаніі “Праваслаўная ініцыятыва”, чый генеральны дырэктар часта друкуе ксенафобскія артыкулы. І хоць БПЦ заяўляла, што не падтрымлівае ніякіх сувязяў з “Праваслаўнай кнігай”, самі супрацоўнікі кнігарні пацвердзілі, што “Праваслаўная кніга” з’яўляецца афіцыйнай крамай БПЦ. Адмаўленне БПЦ гэтых сувязяў выглядае яшчэ больш дзіўна, паколькі БПЦ у 2004 годзе атрымала выключнае права на выкарыстанне слова “праваслаўны.”

Насуперак выдадзенаму ў 2003 годзе загаду генеральнага пракурора і Міністэрства інфармацыі аб канфіскацыі з продажу антысеміцкай і ксенафобскай газеты “Русский вестник”, яе распаўсюджанне працягвалася. Супрацоўнікі “Праваслаўнай кнігі” паведамілі супрацоўнікам амбасады, што яны распрадаюць толькі свае запасы, а не новыя выданні. Прадстаўнікі амбасады таксама знайшлі кнігу “Враги России и славянского мира против Беларуси и президента Лукашенко”. Гэтае ультранацыяналістычнае ксенафобскае выданне змяшчае раздзел пад аўтарствам Уладзіміра Чартовіча, генеральнага дырэктара

“Праваслаўнай ініцыятывы”, выдавецкай кампаніі, заснаванай у Мінску, якая вядама сваімі публікацыямі, што спараджаюць нянавісць у адносінах да яўрэяў, мусульман і іншых меншасцяў. Кніга была надрукавана ў Расіі, але прадавалася ў краіне праз друкарню, якая мае дачыненне да БПЦ.

У адказ на патрабаванне яўрэйскай суполкі пакараць “Праваслаўную кнігу”, у 2004 годзе генеральны пракурор загадаў правесці расследаванне гэтага інцыдэнта, каб выявіць факт незаконнага продажу “Праваслаўнай кнігай” літаратуры, што спараджае нецярпімасць. Потым Генеральная пракуратура перадала справу ў Мінскую гарадскую пракуратуру. У кастрычніку 2004 года Мінская пракуратура заявіла, што падстаў для ўзбуджэння крымінальнай справы няма.

Насуперак запэўніванням розных дзяржаўных чыноўнікаў, што продаж гэтай літаратуры з’яўляецца незаконным, урад не зрабіў ніякіх сур’ёзных захадаў, каб спыніць гандаль ксенафобскай літаратурай у “Праваслаўнай кнізе” і іншых месцах. КСРН сцвярджае, што публікацыя такой літаратуры ў краіне супярэчыць закону, аднак гэта не адносіцца да літаратуры, выдадзенай у Расіі.

У красавіку 2004 года, падчас святкавання праваслаўнага Вялікадня, якое транслявалася беларускім агульнанацыянальным тэлебачаннем, святары БПЦ, паводле наяўных звестак, дапусцілі шэраг антыкаталіцкіх выказванняў. Рымска-каталіцкая царква таксама выказвала занепакоенасць фактамі продажу антыкаталіцкай літаратуры ў кіёсках і на мерапрыемствах, арганізаваных БПЦ.

У перыяд, ахоплены дадзенай справаздачай, рэстытуцыя рэлігійнай уласнасці не праводзілася. Для рэстытуцыі ўласнасці, захопленай ці экспрапрыяванай пры Савецкай уладзе і падчас нацысцкай акупацыі, не існуе заканадаўчай базы, закон таксама абмяжоўвае рэстытуцыю ўласнасці, якая выкарыстоўваецца ў культурных і асветніцкіх мэтах. Больш за тое, урад не вяртае будынкі, калі трэба перасяліць іхніх цяперашніх гаспадароў. Многія былыя сінагогі ў Мінску выкарыстоўваліся ў якасці тэатраў, музеяў, спартыўных комплексаў і піўной; на большасць просьбаў яўрэйскай супольнасці вярнуць гэтыя сінагогі прыходзіла адмова. За справаздачны перыяд яўрэйскія абшчыны не рабілі заяўку на вяртанне будынкаў ці любой іншай нерухомай маёмасці. Некаторыя яўрэйскія лідэры прызнавалі, што праз халакост і масавую эміграцыю яўрэйскае насельніцтва зрабілася такім нешматлікім і не можа выкарыстоўваць усю сваю былую маёмасць. Тым не менш, яўрэі шукаюць магчымасць вярнуць свае культурныя артэфакты, кнігі, і асабліва Торы, што знаходзяцца ў музеях. На канец справаздачнага перыяду ўрад яшчэ не даў афіцыйнага адказу, хоць некаторыя чыноўнікі ў прыватнай размове выказваліся ў падтрымку яўрэйскіх лідэраў і адобрылі іх ініцыятыву.

Каталіцкая суполка ў Мінску запатрабавала вяртання старажытнага касцёла і кляштара, што знаходзіцца ў цэнтры горада. У будынку у цяперашні час размяшчаецца Беларускі дзяржаўны архіў. Урад выразіў гатоўнасць вярнуць касцёл, аднак толькі пасля таго, як будзе знойдзена новае памяшканне і фонды для перавозкі архіваў, чаго цяжка чакаць у бліжэйшым будучым.

Вяртанне ўласнасці рэлігійным суполкам у апошнія гады насіла непаслядоўны характар. За некалькі папярэдніх гадоў рэлігійным групам удалося паспяхова пралабіраваць вяртанне ўладамі некалькіх аб’ектаў уласнасці ў Мінску і іншых гарадах. Згодна са сцвярджэннем КСРН, рэлігійным арганізацыям прадастаўляецца пераважнае права на вяртанне аб’ектаў рэлігійнай уласнасці,

апрача тых выпадкаў, калі яны выкарыстоўваюцца ў культурных і спартыўных мэтах. Афіцыйная статыстыка сведчыць, што за перыяд з 1988 па 2003 год дзяржава вярнула 1120 пабудоў, якія некалі належалі розным рэлігійным групам, у тым ліку 709 – БПЦ, 292 – суполкам рымска-каталіцкай царквы, 29 – стараверам, 12 - іудзеям, 7 – пратэстанцкім суполкам, 3 – мусульманам і 1 – грэка-каталіцкай царкве. Аднак няма ніякай інфармацыі пра тое, што ўрад на працягу апошніх двух гадоў вярнуў якую-небудзь рэлігійную ўласнасць.

Насуперак дадзенаму ў 2003 годзе Прэзідэнтам Лукашэнкам ураду ўказанню не перашкаджаць дзейнасці яўрэйскай суполкі, дзеянні чыноўнікаў па-ранейшаму сведчылі пра недахоп увагі ў адносінах да яўрэйскай супольнасці. У Гродне завершаны земляныя работы і рэканструкцыіія стадыёна, закладзенага ў 1950-ыя гады на месцы былых яўрэскіх могілак. У ходзе земляных работ будаўнікі знаходзілі чалавечыя рэшткі, якія мясцовыя ўлады паабяцалі вывезці з аб'екта для далейшага перазахавання. Замест таго, фатаздымкі, зробленыя прадстаўнікамі яўрэскай супольнасці, дэманструюць чалавечыя рэшткі не толькі ў грунце, што экскаватары высыпалі ў самазвалы, але і ў той зямлі з аб'екта, што ішла на аднаўленне дарожнага насыпу. У красавіку 2004 года падчас свайго візіту супрацоўнікі амбасады знаходзілі чарапы і косткі, раскіданыя па ўсёй тэрыторыі.

І толькі пасля інтэнсіўнага міжнараднага ўсціску губернатар Гродзенскай вобласці Уладзімір Саўчанка падпісаў у 2003 годзе з лідэрам беларускай яўрэйскай абшчыны пагадненне, у якім прадугледжвалася неадкладнае спыненне земляных работ, але дапускаўся працяг агульных будаўнічых работ на аб'екце. У 2003 годзе Саўчанка падпісаў яшчэ адно пагадненне з іншым лідэрам беларускай яўрэйскай абшчыны, у якім прадугледжвалася выманне чалавечых рэштак з дарожнага насыпу і неадкладнае спыненне земляных работ на могілках. У перыяд, ахоплены справаздачай, мясцовая яўрэйская супольнасць дасягнула згоды з мясцовымі ўладамі па пытаннях перазахавання знойдзеных рэштак на тэрыторыі розных яўрэскіх могілак і засведчыла, што задаволена намаганнямі, зробленымі ўрадам. Яны хацелі павесіць шыльду, якая б паведамляла, што стадыён стаіць на былых яўрэйскіх могілках, аднак, хоць яны і атрымалі дазвол ад уладаў, ім бракавала грошай зрабіць гэта. Мясцовыя яўрэйскія лідэры лічаць, што гэтая сітуацыя хутчэй адлюстроўвае абыякавае стаўленне, чым антысемітызм. Вядома, што ў недалёкім мінулым улады такім чынам перакапалі частку ветэранскіх, а таксама праваслаўных могілак.

У лютым 2004 года па распараджэнні Міністэрства адукацыі Беларускі дзяржаўны універсітэт (БДУ) закрыў Міжнародны гуманітарны інстытут (МГІ), што з'яўляўся самастойнай адукацыйнай установай пры БДУ і адзінай вышэйшай навучальнай установай, дзе выкладаўся іудаізм. На канец справаздачнага перыяду праграма па вывучэнні іудаізму ўсё яшчэ захоўвалася як частка вучэбнага плана БДУ, але цяпер ужо без прывязкі да аўтаномнага інстытута.

У адрозненні ад папярэдніх справаздачных перыядаў, у апошні час прадстаўнікі ўраду не рабілі публічных антысеміцкіх выпадаў. У 2003 годзе, згодна матэрыялаў "Associated Press", Сяргей Касцян, намеснік старшыні Камісіі па міжнародных справах ніжняй палаты парламента, адхіліў крытыку ў сувязі з пракладкай газаправода блізу былых яўрэйскіх могілак у Мазыры, абвінаваціўшы яўрэйскіх лідэраў у распальванні "нацыянальнай варожасці". На прэс-канферэнцыі, што адбылася ў 2003 годзе, міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч сказаў, што Беларусь павінна жыць з Расіяй, як браты, а таргавацца, "як жыды".

Паводле сведчанняў КСРН, сам камітэт рэагуе на розныя публічныя праявы ксенафобіі, уведамляючы пры гэтым адпаведныя дзяржаўныя органы, якія абавязаныя ўзбуджаць судовыя справы ў дачыненні да асоб, што дапусцілі гэта; аднак за справаздачны перыяд падобных іскаў не фіксавалася.

**Замахі на свабоду веравызнання**

За справаздачны перыяд урад часта прымаў меры, якія абмяжоўвалі свабоду веравызнання некаторых рэлігійных груп.

Пратэстанцкія, праваслаўныя (не звязаныя з БПЦ) і ўсходнія рэлігійныя суполкі былі аштрафаваныя за незаконнае правядзенне службаў і прадастаўленне памяшканняў, а таксама за іншую недазволеную рэлігійную дзейнасць. Згодна са звесткамі КСРН, пакаранні за такія правапарушэнні грунтаваліся на абвінавачаннях у парушэнні грамадскага парадку або ў незаконных сходах без атрымання папярэдняга дазволу. Закон дазваляе грамадзянам збірацца для малітвы ў прыватных жылых памяшканнях, але ён накладае абмежаванне на выкананне рытуалаў, абрадаў ды правядзенне цырымоній у такіх месцах і патрабуе папярэдняга атрымання згоды з боку мясцовых уладаў.

У кастрычніку 2004 года судом быў накладзены штраф на пастара зарэгістраванай Царквы святла сусветнага поўнага Евангелля ў памеры 174 долары ЗША (345000 беларускіх рублёў, амаль месячны заробак) за нібыта правядзенне рэлігійнага сходу ў яго дома.

28 снежня 2004 года за сход, які адбыўся ў кароўніку, суд аштрафаваў адміністратара Царквы Новага Жыцця Васіля Юрэвіча на сумму 1500 долараў ЗША (3200000 беларускіх рублёў) за быццам бы арганізацыю недазволенага сходу. Абапіраючыся на гэтае судовае рашэнне, Мінгарвыканкам вынес Царкве новага жыцця папярэджанне пра магчымасць спынення яе дзейнасці 30 снежня 2004 года. 22 сакавіка 2005 года суд аштрафаваў царкоўнага пастара Вячаслава Ганчарэнку на 334 долары ЗША (714000 беларускіх рублёў) таксама быццам бы за правядзнне недазволенага сходу ў сваім доме. Гэта прывяло да другога папярэджання царкве, зробленага Мінгарвыканкамам 1 красавіка 2005 года. Закон дапускае толькі два папярэджанні, пасля чаго царква можа быць закрытая.

У лютым 2004 года святар Міжнароднага саюза баптысцкіх цэркваў (МСБЦ) атрымаў папярэджанне за правядзенне рэлігійных службаў у горадзе Салігорску. Гэтай арганізацыі было прапанавана з 1 красавіка 2004 года спыніць сваю незаконную рэлігійную дзейнасць. У красавіку 2004 года Мозырскі суд аштрафаваў членаў МСБЦ на 176 долараў ЗША (380000 беларускіх рублёў) кожнага пасля таго, як яны павіншавалі пацыентаў мясцовага шпіталя з Вялікаднем. МСБЦ не зарэгістраваны ў Беларусі, што робіць любую яе дзейнасць незаконнай.

У 2003 годзе місіянер Навагрудскага аб’яднання баптыстаў, Юрый Дзянішчык, быў аштрафаваны на суму прыкладна 15 долараў ЗША (33000 беларускіх рублёў) за незаконнае правядзенне малітоўнай службы ў прыватным будынку, што зарэгістраваны на імя аб’яднання.

Улады працягваюць праследаваць членаў БАПЦ, якія ўжо пакінулі спробы зарэгістравацца. 2 лістапада 2004 года пракурор Мінскай абласной пракуратуры

ўзбудзіў крымінальную справу супраць БАПЦ, якая працягвала спробы ўзнавіць будынак былой праваслаўнай царквы ў населеным пункце Сёмкаў Гарадок. Улады заявілі, што яны адновяць і пераабсталююць царкву для законнага гаспадара – БПЦ. БПЦ, паводле наяўных звестак, плануе перамясціць туды сваю суполку, якая на сённяшні дзень ладзіць мерапрыемствы ў пераабсталяваным вагоне цягніка. Да таго, 26 жніўня 2004 года суд спагнаў са старшыні суполкі БАПЦ Леаніда Акаловіча штраф у памеры 9 долараў ЗША (19000 беларускіх рублёў) за недазволенае будаўніцтва. 25 лістапада 2004 года суд зноў аштрафаваў яго на 11 долараў ЗША (24000 беларускіх рублёў) за кіраўніцтва незарэгістраванай рэлігійнай арганізацыяй.

Урады па-ранейшаму праследавалі, штрафавалі і затрымлівалі прыхільнікаў Харэ Крышна, кажучы дакладней, за незаконнае распаўсюджванне рэлігійнай літаратуры.

Пад непасрэдным уціскам уладаў і з-за няспынных праследаванняў рэлігійных арганізацый БАПЦ, прыналежныя да іх святар Ян Спасюк і кіраўнікі суполкі Святло Кайласа Сяргей і Таццяна Акаданавы вымушаны былі ў 2003 годзе пакінуць краіну. Акрамя Акаданавых, некаторым іншым членам суполкі таксама прыйшлося з'ехаць за мяжу ў сувязі з пастаянным уціскам з боку ўладаў. У выніку ад'езду членаў суполкі і з-за пастаяннага страху перад праследаваннямі з боку ўладаў члены суполкі Святло Кайласа не прадпрымалі ніякіх актыўных дзеянняў за справаздачны перыяд. Перад гэтым членаў групы штрафавалі, праследавалі і звальнялі з працы за іх прыналежнасць да гэтай веры.

Пра затрыманні і арышты вернікаў інфармацыі не было.

### Прымусовы зварот у веру

Не паступала паведамленняў ні пра прымусовы зварот у веру, ні пра непаўналетніх грамадзян ЗША, якія былі выкрадзены або незаконна вывезены са Злучаных Штатаў, ні пра адмову прадставіць магчымасць такім грамадзянам вярнуцца ў Злучаныя Штаты.

### Пагрозы з боку тэрарыстычных арганізацый

За справаздачны перыяд не паступала паведамленняў пра якія-небудзь пагрозы з боку тэратыстычных арганізацый у адрас канкрэтных рэлігій.

### Рост павагі да свабоды веравызнання

За справаздачны перыяд у Беларусі палепшылася сітуацыя ў стаўленні да рымска-каталіцкай царквы. 8 лютага 2005 года прэзідэнт Лукашэнка і кардынал Свёнтак сустрэліся і дамовіліся надалей умацоўваць сувязі паміж уладамі і рымска-каталіцкай царквой. Так, прэзідэнт Лукашэнка прапанаваў урадавую дапамогу ў рэстаўрацыі фрэсак кафедральнага касцёла, размешчанага ў цэнтры Мінска. Са свайго боку кардынал падзякаваў Беларускай дзяржаве за дазвол на існаванне і на свабодную дзейнасць каталіцкай царквы.

У 2003 і зноў у 2004 годзе ўлады знізілі зямельны падатак для ўсіх рэлігійных арганізацый. Рэлігійныя аб'яднанні, якія займаюць будынкі, што лічацца аб'ектамі гістарычнай і/або архітэктурнай каштоўнасці, не плацяць падатак на зямлю. У

лютым 2004 года ў цэнтры Мінска пачалася рэканструкцыя разбуранай у савецкія часы мячэці, якая працягвалася ўвесь справаздачны перыяд. Мінгарвыканкам выдзяліў Мусульманскаму рэлігійнаму саюзу зямлю для пастаяннага карыстання. Мусульманам не трэба было набываць зямлю і плаціць за яе арэнду. Яны мусяць уносіць толькі месячны падатак на зямлю. Рымска-каталіцкая царква на тых самых умовах будуе цяпер у Мінску касцёл.

У 2004 годзе ўрад і БПЦ працавалі разам над улагоджваннем адносін з праваслаўнымі грамадзянамі, якія не жадаюць па рэлігійных меркаваннях мірыцца з сістэмай індывідуальных нумароў у новых пашпартах.

За справаздачны перыяд адвентысты 7-га дня адчулі ў сваім становішчы пэўныя зрухі ў лепшы бок. У лютым 2005 года Адвентысцкі тэалагічны інстытут афіцыйна атрымаў пацверджанне аб сертыфікацыі. У красавіку 2005 года пабачыў свет першы нумар часопіса гэтай царквы, што можна ацэньваць як прарыў пратэстанцкай веры ў краіне.

**Частка 3. Адносіны ў грамадстве**

У цэлым прыязныя ўзаемадачыненні паміж рэлігіямі і шырока распаўсюджаная ў грамадстве этыка цярпімасці садзейнічалі свабодзе веравызнання, аднак па-ранейшаму прысутнічалі антысемітызм і негатыўнае стаўленне да рэлігійных меншасцяў. У красавіку 2005 года незалежная сацыяльная арганізацыя НОВАК правяла апытанне, што ўключала пытанне: “Наколькі вы давяраеце дзяржаве, грамадскім інстытутам і арганізацыям?” Згодна апытанню, БПЦ карыстаецца найбольшым даверам у краіне: 77,5 адсоткаў рэспандэнтаў давяраюць ёй (армія займае другое месца з 71,3 адсоткамі, Нацыянальны банк – трэцяе з 60,1 адсоткамі і прэзідэнт Лукашэнка – чацвёртае з 53,8 адсоткамі). 45,2 адсоткі рэспандэнтаў давяраюць каталіцкай царкве і толькі 15,4 адсоткі – пратэстанцкім цэрквам. Важна адзначыць, тым не менш, недахоп даверу не абавязкова азначае высокую ступень недаверу. Калі 36 адсоткаў апытаных не давяраюць пратэстанцкім цэрквам, дык 48,6 адсоткаў далі проста адказ “не ведаю”. Толькі 19,9 не давяраюць каталіцкай царкве, тады як 34,9 адсоткаў рэспандэнтаў адказалі “не ведаю”.

Яўрэйскія арганізацыі працягвалі крытыкаваць улады за нежаданне асудзіць антысеміцкія выказванні дзяржаўных чыноўнікаў, спыніць продаж антысеміцкай літаратуры і абараніць могілкі і помнікі ахвярам халакосту. У 2003 годзе два дэпутаты Палаты прадстаўнікоў парламента наведалі мінскую сінагогу, у якую была кінута запальная бомба, і асудзілі злачынства. У перыяд, разгледжаны справаздачай, урад таксама не пажадаў асудзіць акты вандалізму ў дачыненні да праваслаўных могілак, пратэстанцкіх цэркваў і помнікаў.

5 лістапада 2004 года вандалы падпалілі вянкі, раскідалі кветкі, разбілі зорку Давіда ў мемарыяльным комплексе ахвярам халакосту ў цэнтры Брэста. З часу адкрыцця мемарыял быў 5 разоў апаганены. Міліцыя ні разу не адшукала і не пакарала нікога за гэтыя злачынствы. 26 красавіка 2005 года хуліганы таксама пашкодзілі мемарыял памяці яўрэяў, што загінулі падчас другой сусветнай вайны, узведзены ў Лідзе. Яўрэйская абшчына не паведаміла пра акт вандалізму ў міліцыю, паколькі ў лідскім мемарыяле акты вандалізму адбываюцца кожную вясну, але ніхто так і не быў затрыманы. Невядомыя хуліганы разбілі 20 надмагільных камянёў у мястэчку Мікашэвічы ў пачатку траўня 2005 года.

Мясцовыя яўрэі крытыкавалі міліцыю за тое, што яна не пажадала адрэагаваць на злачынствы і не арыштавала каго-кольвечы з падазроных асобаў, падкрэсліваючы, што могілкі знаходзяцца практычна за некалькі метраў ад аддзялення міліцыі.

За справаздачны перыяд не назіралася павышэння колькасці актаў вандалізму на яўрэйскіх могілках у Бабруйску ды Чэрвені і мемарыяльным комплексе ахвярам халакосту ў Цімкавічах.

Яўрэйская супольнасць занепакоена распаўсюджаннем ідэі "вялікага славянскага саюза", пашыранай сярод нацыяналістычных арганізацый, што дзейнічаюць у краіне, такіх як Рускае нацыянальнае адзінства (РНА), якое яшчэ праяўляе актыўнасць, не зважаючы на афіцыйны роспуск у 2000 годзе, а таксама нацыянал-бальшавісцкая партыя, яшчэ адна руская экстрэмісцкая арганізацыя. У студзені 2004 года члены РНА распаўсюджвалі антысеміцкую літаратуру ў гарадскіх аўтобусах Гомеля. Гэты інцыдэнт адбыўся ў той самы месяц, калі яўрэйскія абшчынныя цэнтры ў Гомелі і Полацку былі апаганеныя насценнымі надпісамі РНА. Улады пачалі расследаванне гэтых актаў вандалізму. У прааналізаваны справаздачай перыяд з'явіўся вэб-сайт, які выдаецца за электронную старонку яўрэйскіх артадаксальных скінхэдаў (ЯАСХ), арганізацыі, якая нібыта складаецца з яўрэйскай моладзі, што вырашыла змагацца з антысемітызмам і ксенафобіяй. Насуперак заяўленым "арганізацыяй" мэтам, вэб-сайт заклікае яўрэяў да правакацыйных дзеянняў у адносінах да ўрада ў барацьбе за сваю справу і ўтрымлівае  зневажальныя выказванні пра неяўрэйскіх грамадзян Беларусі і вядомых кіраўнікоў беларускай яўрэйскай супольнасці. Некалькі яўрэйскіх лідэраў, што палічылі вэб-сайт зневажальным і правакацыйным, асудзілі яго і выказалі афіцыйным уладам скаю занепакоенасць. Гэты вэб-сайт мае спасылку на іншы вэб-сайт, які нібыта падтрымліваецца скінхэдамі Харэ Крышна. Паклёпніцкія вэб-сайты так званых яўрэйскіх артадаксальных скінхэдаў і скінхэдаў Харэ Крышна працягвалі дзейнасць цягам усяго справаздачнага перыяду, нягледзячы на іх асуджэнне лідэрамі яўрэйскіх і іншых арганізацый.

Афіцыйны беларускі праваслаўны малітоўны каляндар, надрукаваны ў Мінску, як і раней адзначае 20 траўня як гадавіну гібелі ў 1690 годзе Гаўрыіла Беластоцкага, малалетняга дзіцяці, якога каля Гродна нібыта звялі са свету яўрэі. Малітва за 20 траўня, прысвечаная Беластоцкаму, называе яўрэяў "сапраўднымі звярамі", якія быццам бы выкралі і забілі Беластоцкага ў рэлігійных мэтах.

Лідэры яўрэйскай супольнасці мяркуюць, што цяпер адбываецца меней фактаў вандалізму, чым некалькі гадоў таму, часткова дзякуючы міжнароднаму ўціску, а таксама узмацненню высілкаў, якія робяць мясцовыя ўлады для абароны рэлігійных аб'ектаў. Акрамя таго, мясцовыя ўлады і жыхары часта аднаўляюць пашкоджаныя помнікі і магілы за ўласны кошт. Паводле інфармацыі КСРН, абласныя ўлады па ўсёй краіне працягваюць прымаць меры для папярэджання вандалізму, у тым ліку будуюць агароджы вакол могілак, рэгулярна патрулююць тэрыторыю вакол іх і збіраюць інфармацыю ды робяць справаздачы пра выпадкі вандалізму.

Як і ў папярэднія гады, невядомыя хуліганы працягвалі разбураць як праваслаўныя, так і неправаслаўныя крыжы, пастаўленыя ў Курапатах, урочышчы, дзе па загадзе народнага камісарыята унутраных спраў (НКУС) у 1930-ыя гады было расстраляна больш за 300 тысяч чалавек. Аднак надмагільнік у памяць

мусульманскіх і яўрэйскіх ахвяр там застаўся некранутым. Улады не рабілі бачных намаганняў у пошуку адказных за разбурэнне крыжоў.

23 кастрычніка 2004 года ў Брэсцкай вобласці злодзеі скралі 12 ікон і бронзавы крыж з царквы БПЦ. Міліцыя пачала расследаванне. Перад гэтым, таксама ў кастрычніку, брэсцкая абласная міліцыя і мінская гарадская міліцыя злавілі двух злодзеяў і знайшлі дзве з трох, скрадзеных у 2001 годзе ікон. Дзве знойдзеныя іконы каштавалі не меней за 75000 долараў ЗША.

У красавіку 2004 года брэсцкія ўлады адмовіліся распачаць крымінальную справу аб рабаўніцтве евангельскай хрысціянскай царквы ў пасёлку Хаціслаў, якое было ўчынена ў сакавіку 2004 года. Да гэтага, пачынаючы з 2000 года, паводле наяўных звестак, царква цярпела ад вандалаў шэсць разоў. У 2004 годзе БАПЦ заявіла, што святары БПЦ у суправаджэнні чыноўнікаў Мінскай вобласці наведалі шэраг мястэчак Мінскай вобласці, дзе заклікалі мясцовых жыхароў не браць удзел у службах, якія ладзіць БАПЦ.

Няма ніякіх пацверджанняў таго, што БПЦ зменіць свой намер супрацоўнічаць толькі з тымі канфесіямі, што маюць у краіне "гістарычныя карані".

У студзені 2004 года арганізацыя "Грамадзянская ініцыятыва за свабоду веравызнання" выдала другую частку "Белай кнігі" – зборніка дакументаў, якія даюць падрабязную інфармацыю пра шматлікія парушэнні ўрадам свабоды веравызнання, інфармуюць пра Закон аб рэлігіі і прыводзіць розныя справаздачы аб сітуацыі са свабодай веравызнання ў краіне.

**Частка 4. Палітыка Урада ЗША**

Урад ЗША абмяркоўвае пытанні свабоды веравызнання з урадам у межах сваёй агульнай палітыкі па абароне правоў чалавека. Супрацоўнікі амбасады падтрымлівалі рэгулярныя кантакты з прадстаўнікамі рэлігійных груп і дзяржаўнымі службовымі асобамі, адказнымі за рэлігійныя пытанні, сустракаліся з грамадзянамі ЗША рознага веравызнання, якія пражываюць у Беларусі або часта прыязджаюць сюды, з мэтай абмеркавання пытанняў свабоды веравызнання ў краіне.

Падчас сустрэч з рознымі дзяржаўнымі чыноўнікамі і прадстаўнікамі міністэрстваў, супрацоўнікі амбасады закраналі пытанні, звязаныя з Законам аб рэлігіі 2002 года, пытанні далейшага продажу літаратуры, што сее нецярпімасць, у месцах, звязаных з урадам і БПЦ, і пытанні адмовы ў рэгістрацыі некаторых рэлігійных суполак. Супрацоўнікі амбасады таксама ўздымалі пытанні пра бяздзейнасць урада ў адказ на акты нецярпімасці і спробы захаваць рэлігійны status quo шляхам дыскрымінацыйных дзеянняў.

Амбасада пільна сачыла за працягам продажу антысеміцкай і ксенафобскай літаратуры ў кіёсках і на мерапрыемствах, звязаных з БПЦ, і праз дзяржаўную сетку распаўсюджвання друкаваных выданняў. На працягу ўсяго справаздачнага перыяду супрацоўнікі амбасады таксама некалькі разоў наведвалі месца яўрэйскіх могілак ў Гродна і абмяркоўвалі сітуацыю з мясцовымі ўладамі і кіраўнікамі супольнасці. Супрацоўнікі амбасады, у тым ліку пасол, бралі ўдзел у шэрагу мерапрыемстваў, што праводзіліся рознымі рэлігійнымі групамі. Амбасада таксама

рэгулярна абмяркоўвала рэлігійныя пытанні з прадстаўнікамі замежных дыпламатычных місій, акрэдытаваных у краіне.

Падрыхтавана 8 лістапада 2005 года